# Запаведную частку Белавежскай пушчы павялічаць больш чым удвая.

У нацыянальным парку "Белавежская пушча" завершана распрацоўка доўгатэрміновага плана кіравання ўнікальнай прыроднай тэрыторыяй. Як паведамілі ў службе інфармацыі і грамадскіх сувязяў Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, гэтым займаліся спецыялісты Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук. Удзел у гэтай рабоце ўзялі таксама галоўныя нацыянальныя эксперты ў гэтай галіне. Навукоўцы максімальна ўлічвалі канструктыўныя заўвагі і прапановы ўсіх, каму неабыякавы лёс Белавежскай пушчы.

Маштабны дакумент падрыхтаваны ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай развіцця асабліва ахоўваемых прыродных тэрыторый рэспублікі на 2008—2014 гады. Праект плана ўхвалены навукова-тэхнічным саветам Нацпарка, узгоднены з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, прайшоў экспертызу ў Савеце Еўропы. Дарэчы, наяўнасць такога дакумента — адна з умоў працягу дзеяння Дыплома Савета Еўропы, які Белавежская пушча атрымала ў 1997 годзе.

Першачарговыя меры мяркуецца рэалізаваць на працягу пяці гадоў, пасля чаго план будзе скарэктаваны на наступную пяцігодку. Як адзначыў генеральны дырэктар навукова-практычнага цэнтра НАН Беларусі Міхаіл Нікіфараў, уся гістарычная частка Белавежскай пушчы на нашай тэрыторыі павінна быць закансервавана, а ў далейшым запаведную зону Нацпарка мяркуецца павялічыць больш чым удвая.

Значная роля адводзіцца праектам аднаўлення гідралагічнага рэжыму, які ў свой час быў парушаны меліяратыўнымі работамі, захаванню пушчы як лесабалотнага комплексу, падтрыманне ўнікальных адкрытых балотаў. У прыватнасці, намечаны меры па папярэджанні зарастання кустоўем балота Дзікае, якое займае плошчу 1,2 тысячы гектараў. Таксама плануецца рэалізаваць мерапрыемствы па ахове і аднаўленні рэдкіх і каштоўных відаў прыродных супольнасцяў, па правядзенні навуковых даследаванняў і маніторынгу, па экалагічным інфармаванні і г.д.

Прадугледжана добраўпарадкаванне 10 населеных пунктаў, якія размешчаны на тэрыторыі Нацпарка. Пры гэтым, як мяркуецца, будзе захавана іх аўтэнтычнасць і традыцыйны стыль. Для наведвальнікаў Белавежскай пушчы распрацуюць
4 новыя турыстычныя маршруты.

***Мікалай ЛІТВІНАЎ.***

**Источник:** Звязда.-2009.-17 лют.-С. 7.